DOI:10.17951/sb.2025.19.97-115
Studia Białorutenistyczne 19/2025 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Mikałaj Chaustowicz

University of Warsaw (Poland)
e-mail: m.khaustovich@uw.edu.pl
https://orcid.org/0000-0002-3007-0603

# Загадка дыктэрыйкі "Кручаная баба"

*The Mystery of the Anecdot "Kruchanaya Baba"*

*Zagadka dykteryjki „Kruczanaja baba"*

**Abstract**

This article is devoted to the issue of Belarusian-language literary heritage of Adam Plug. This famous Polish-speaking writer from historical Lithuania in his works used not only Belarusian folklore, but also the Belarusian language itself. But did he write separate works in Belarusian? In 1918, bibliophile and literature historian Romuald Ziemkiewicz claimed that he had in his hands a Belarusian manuscript by Adam Plug from 1849, which contained 4 stories from the life of the people and one legend. From this manuscript, only one work saw the daylight – the dykteryjka or anecdote *Kruchanaya baba*. Printed in a little-known publication of the revolutionary period, the dikteryjka remained unknown to literature historians for a long time. Although it was introduced into readership circulation in the 1990s, it has not received proper historical-literary commentary to this day. The research shows that the Belarusian-language dikteryjka *Kruchanaya baba* is a component part of the novel *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela* (1849) by Adam Plug. In fact, it is a translation of the bilingual Polish-Belarusian dykteryjka *A jak pan sało krau*. Who carried out the translation? The author himself, Adam Plug? Someone from the circle of the writer's school friend Eustachy Rdultowski at the Snov estate? However, I tend to hypothesize that it was Romuald Ziemkiewicz. Firstly, this publication can be interpreted as a manifestation of his „literary support" for the Belarusian national revival, and secondly, the literature historian often used similar methods in his activities.

**Keywords**: the Belarusian-language legacy of Adam Plug, bilingual works, „literary support" of the national revival, Romuald Ziemkiewicz as a translator, attribution

## Abstrakt

Artykuł został poświęcony zagadnieniu białoruskojęzycznego dziedzictwa literackiego Adama Pługa. Ten znany literat polskojęzyczny z historycznej Litwy w swojej twórczości wykorzystywał nie tylko białoruski folklor, lecz także sam język białoruski. Ale czy pisał on również odrębne utwory w tym języku? W 1918 roku bibliofil i historyk literatury Romuald Ziemkiewicz poinformował, że był w posiadaniu białoruskiego rękopisu Adama Pługa z 1849 roku. Zawierał on cztery opowiadania z życia ludu oraz jedną legendę. Z tego rękopisu ujrzał światło dzienne jedynie jeden utwór – opublikowana w mało znanym wydaniu z czasów rewolucyjnych dykteryjka *Kruczanaja baba*, która przez długi czas pozostawała nieznana historykom literatury. Dopiero w latach 90. XX wieku weszła do obiegu czytelniczego, jednak do dziś nie doczekała się należnego komentarza historyczno-literackiego. Nasze badania wykazały, że białoruskojęzyczna dykteryjka *Kruczanaja baba* stanowi integralną część powieści Adama Pługa *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela* (1849), a w istocie jest tłumaczeniem dwujęzycznej polsko-białoruskiej dykteryjki *A jak pan sało krau*. Kto dokonał owego tłumaczenia? Sam autor – Adam Pług? A może ktoś z otoczenia szkolnego przyjaciela pisarza, Eustachego Rdułtowskiego, w majątku Snów? Skłaniamy się jednak ku hipotezie, że był to Romuald Ziemkiewicz. Po pierwsze, publikację tę można interpretować jako przejaw jego „literackiego wsparcia" dla białoruskiego odrodzenia narodowego, po drugie zaś – historyk literatury nieraz w swojej działalności stosował podobne metody.


**Słowa kluczowe**: białoruskojęzyczna spuścizna Adama Pługa, utwory dwujęzyczne, „wsparcie literackie" odrodzenia narodowego, Romuald Ziemkiewicz jako tłumacz, atrybucja


## Анатацыя

У артыкуле разглядаецца пытанне беларускамоўнае літаратурнае спадчыны Адама Плуга. Як вядома, знаны польскамоўны літаратар з гістарычнае Літвы выкарыстоўваў у сваёй творчасці не толькі беларускі фальклор, але і беларускую мову. Але ці пісаў ён па-беларуску асобныя творы? У 1918 г. бібліяфіл і гісторык літаратуры Рамуальд Зямкевіч сцвердзіў, што меў у сваіх руках беларускі рукапіс Адама Плуга з 1849 г., у якім былі 4 апавяданні з жыцця народа і адна легенда. З гэтага рукапісу даследнік апублікаваў толькі адзін твор – дыктэрыйку *Кручаная баба*. Надрукаваная ў малавядомым выданні рэвалюцыйнага часу дыктэрыйка доўгі час заставалася невядомай гісторыкам літаратуры. Хоць у 1990-я гг. і была ўведзеная ў чытацкі ўжытак, але да сённяшняга дня не атрымала належнага гісторыка-літаратурнага каментара. Нашае даследаванне паказала, што беларускамоўная дыктэрыйка *Кручаная баба* з'яўляецца складковаю часткаю аповесці Адама Плуга *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela* (1849). Больш дакладна: перакладам двухмоўнае польска-беларускае дыктэрыйкі *A jak pan sało krau*. Хто ажыццявіў пераклад? Сам аўтар, Адам Плуг? Нехта з атачэння школьнага сябра пісьменніка Яўстаха Рдултоўскага ў маёнтку Сноў? Мы, аднак, схільныя лічыць, што здзейсніў гэта Р. Зямкевіч. Па-першае, дадзеную публікацыю можна разглядаць як ягоную „літаратурную падтрымку" беларускага нацыянальнага адраджэння, а па-другое, гісторык літаратуры няраз выкарыстоўваў падобныя метады ў сваёй дзейнасці.

**Ключавыя словы**: беларускамоўная спадчына Адама Плуга, двухмоўныя творы, „літаратурная падтрымка” нацыянальнага адраджэння, Рамуальд Зямкевіч як перакладчык, атрыбуцыя

У шмат якіх сваіх творах Адам Плуг (Антоні Пяткевіч, 1823–1903) узнёсла паэтызуе родны кут, край дзяцінства і маладосці, які мусіў пакінуць на дваццаць трэцім годзе жыцця і які наведаў хіба толькі адзін раз – летам-восенню 1856 г. Расстанне з любаю Літвою няраз абуджала ў душы літаратара сентыментальныя ўспаміны, чулыя прызнанні ў любові [сам паэт называў іх „apostrofami do Litwy” (Pług, 1863a, s. IX)] да *Kraju lat dziecinnych*.

Вядома, мы памятаем, што дадзены матыў з часоў Адама Міцкевіча і Ігнацы Ходзькі ўжо стаўся традыцыйным: А. Плуг адно „паўтараў” сваіх вялікіх папярэднікаў. Так, у паэме *Pamiątki domowe*[1] ён пісаў:

Litwo moja! Litwo droga!
Wymodlona, wypłakana,
Wycierpiana mi u Boga,
Ziemio moja obiecana![2]
(Pług, 1858, s. 25)

Замілаванне да Айчыны ў А. Плуга пачало выяўляцца ў ягоных першых літаратурных тэкстах з выкарыстання даўніх беларускіх прымхаў і забабонаў (гл. напісанае ў маі 1844 г. у маёнтку Бабіраў на Бабруйшчыне[3], а ў 1847 г. выдадзенае пад уласным прозвішчам і ўласным коштам у Вільні ў друкарні Адама Завадскага (1814–1875) фантастычнае апавяданне *Wigilia świętego Jana*); з апісанняў краявідаў Літвы, таго, што з далёкага Падолля, „śród ludzi w poniewierce”, падавалася родным і блізкім; з успамінаў утульнае хаткі сваіх бацькоў (напр., у вершы *Żukowy Borek* – бацькаўшчыны ўжо страчанае, але яшчэ з надзеяю хоць калі-небудзь вярнуцца):

Z serca, z Nieba czerpię siły
I nadzieję, i pociechę:
Znajdę kiedyś własną strzechę,
Znajdę kiedyś domek miły –
Małą chatkę pod jedliną,

1 Пазней твор друкаваўся пад тытулам *Piosnka rodzinna* (гл.: Pług, 1863b, s. 179–275).

2 „Літва мая! Літва дарагая! / Вымаленая, выплаканая, / Выпакутаваная мной у Бога, / Зямля мая абяцаная!” (Тут і далей пераклад з польскай мовы аўтара артыкула).

3 У маёнтку Бабіраў Язафата Матэвуша Беліновіча, рэгента Бабруйскага павета, і ягонае жонкі Антаніны Воўк-Ланеўскае, якія мелі сына Эмерыка Леанарда, А. Пяткевіч працаваў хатнім настаўнікам (гл.: Vâroŭkin-Šèlûta, online).

Pod zieloną, pod darniną,
I odpocznę w niej dowoli,
Cicho, błogo, słodko, miło!..
O gdyby to w Litwie było!..
Ej! Dość tego! Serce boli![4]
(Pług, 1849b, s. 240)

Напачатку безыменная, Айчына А. Плуга ўрэшце займела сваё гістарычнае празванне ў невялікай аповесці *Spowiedź: Ustęp z życia mego przyjaciela*:

Bogdajto naszę Litwę! bogdajto nasze Polesie! Mówcie wy sobie co chcecie: chwalcie, wysławiajcie to wasze Podole razem z Ukrainą, te wasze stepy niezmierzone okiem, i te wasze wzgórza, i Dniestr i Bug i Dniepr wasz; ja się nie zachwycę, ja się nie uniosę; – i choćbyście rzekli, że natura wilka do lasu ciągnie, zawsze będę wzdychał do Polesia i do Litwy, do tych puszcz odwiecznych, do bagnisk, piasków, do łąk i jeziorek; i jednej kropelki z Niemna nie oddam za wszystkie wody Dniestru, Bugu i Dniepru.
Z resztą już sławcie sobie Podole, sławcie Ukrainę; lecz nie wspominajcie, proszę, o jakichś tam Włoszech, o Szwajcarji jakiejś! I bogdajbym nigdy z Niemna wody nie pił, i bogdajbym nigdy nie zadrzémał w cieniu litewskiej jedliny, uśpiony jéj szeptaniem cichem, jeżeli nieprawda, że wolałbym z kijem pielgrzymim wlec się do moich lasów, niżli najwygodniej do tych zachwalonych podróżować krajów.
Tak to ja kocham Litwę...[5] (Pług, 1849a, s. 131).

Адначасна з развіццём тэмы Літвы літаратар у сваіх польскамоўных тэкстах – вершаваных і празаічных – шырока выкарыстоўвае беларускую мову; выкарыстоўвае адмыслова, дзеля ліцвінскага каларыту, дзеля адлюстравання рэалій мясцовага жыцця (*lubczyk*, *ośmak*). Ліцвінска-беларускія сяляне

---

4 „З сэрца, з Неба чэрпаю сілы / І надзею, і пацеху: / Знайду калісьці ўласную страху, / Знайду калісьці домік мілы – / Малую хатку пад ялінай, / Пад зялёнай, пад дзірванам, / І адпачну ў ёй уволю, / Ціха, добра, салодка, міла!... / О, каб гэта ў Літве было!.. /Эй! Досыць таго! Сэрца баліць!”.

5 „Блаславі, Божа, нашую Літву! Блаславі, Божа, нашае Палессе! Кажыце сабе, што хочаце: хваліце, услаўляйце тое ваша Падолле разам з Украінай, тыя вашыя бясконцыя стэпы, і тыя вашыя пагоркі, і Днестр, і Буг, і ваш Дняпро; а я не захаплюся, я не маю да іх замілавання; – і хоць бы вы казалі, што ваўчыная натура ваўка ў лес цягне, я ўсё адно буду ўздыхаць па Палессі і па Літве, па тых адвечных пушчах, па балотах, пясках, па лугах і азёрах; і адной кроплі з Нёмана не аддам за ўсе воды Днястра, Буга і Дняпра. / А зрэшты, хваліце сабе Падолле, хваліце Украіну; але не згадвайце, калі ласка, нейкую там Італію, нейкую там Швейцарыю! І хай бы я ніколі вады з Нёмана не піў, і хай бы ніколі не задрамаў у цені літоўскай яліны, прыспаны яе ціхім шэптам, калі няпраўда, што я лепш пайду з пілігрымскім кіем да маіх лясоў, чым самым зручным чынам буду падарожнічаць па тых услаўленых краінах. / Вось як я люблю Літву...”.

размаўляюць у яго, праўда, па-польску, але сяды-тады з іхных вуснаў гучыць і беларуская мова. Напр., шавец Казімір спявае:

Choć ja upiusia
Da nie powaliusia.
(Pietkiewicz, 1847, s. 11).

Асабліва выразна адчуваецца прысутнасць беларускае мовы ў аповесці *Spowiedź*, якую ў пэўнай ступені можна назваць двухмоўнаю: суддзя Гарбузок часта ўжывае беларускія прыказкі і прымаўкі (*Nie budzi licha, kali licho spić*; *Boh trojcu lubić*; *Chicier Zmicier, da i Kuźma nie dureń*; *Kautni mój Bartuniu na druhuju nożku*; *Dziesiąta woda na kisielu*; *Ty sam czełowiek, ja nie czełowiek, ja pińczuk*!; *Stryżanoje, holanoje*), спявае беларускія песні (*Ażenisie nie żurysie*, / *Budziesz panawaci*; / *Żonka budzieć huski pascić*, / *A ty zahaniaci*; *Jechau, jechau, pierejechau*, / *Czemu ka mnie nie zajechau*?; *Lecieu piewień czerez reku*, / *Skazau kakareku*!; *Tilin, tilin, bim, bam*, / *Prydzi, prydzi, blin dam*!; *Mużyk każeć jaczmień*, / *Żonka każeć hreczka*, / *Nie każyż mnie, ni słóweczka*, / *Niechaj budzieć hreczka*), а таксама апавядае беларускамоўныя жартоўныя гісторыі (показкі-дыктэрыйкі).

Аповесць *Spowiedź: Ustęp z życia mego przyjaciela* ўпершыню была надрукаваная ў 1849 г. у трох тамах часопіса Юзафа Ігнацы Крашэўскага „Athenaeum” (t. III, s. 129–172; t. IV, s. 201–241; t. V, s. 85–115), а ў наступным годзе апублікаваная асобнаю кніжкаю ў Вільні[6]. У 1854 г. аповесць друкуецца трэці раз у трохтомніку *Zagon rodzinny: Zbiór obrazków, gawęd i fraszek rymowanych i nierymowanych* (гл.: Pług, 1854a, t. I, s. 7–143).

Тры публікацыі аповесці цягам пяці гадоў – гэта сведчанне тае папулярнасці, якую мела яна на Літве-Беларусі на пачатку 1850-х гг. Літаратурная і газетная крытыка таксама няраз звяртала ўвагу на *Spowiedź*, якую Караль Вітэ (1814–1878) палічыў „za najcelniejszy nabytek dla «Athenaeum»” ([Witte], 1850a, nr 272, s. 4) і паставіў вышэй за гістарычную працу Ю.І. Крашэўскага *Litwa za Witolda*, а вобраз суддзі Гарбузіка, на яго думку, „tyle ma w sobie prawdy i tak uprzedza nas dla staruszka, że go wolimy nawet od Jowialskiego, chociaż Jowalski jest utworem znakomitego Fredry”[7] ([Witte], 1850b, nr 273, s. 4). Іншыя рэцэнзенты, адначасна са станоўчым, адзначалі і недахопы твора: што „w powieściach Pługa wiele

---

6 На жаль, нам не ўдалося пазнаёміцца з гэтым выданнем, мяркуем, аднак, што яно, як і іншыя „атэнаэмаўскія” аповесці А. Плуга, – папраўленая адбітка з часопіса. У асобным выданні (гл. у беларускім перакладзе Мікалая Хмяльніцкага: Pług, 2013, s. 504–585) і ў трохтомніку, што выйшаў у свет у 1854 г., галоўная гераіня твора мае імя Аліна, а не Галіна, як у часопіснай публікацыі.

7 „У ім так шмат праўды, і гэта так схіляе нас да старога, што мы аддаём яму перавагу нават перад Ёвяльскім, хоць Ёвяльскі – гэта герой знакамітага Фрэдра”.

młodzieńczego zapału, wiele talentu, ale mało życia”[8] (W.P.[9], 1854, nr 148, s. 4), што „zawsze przypominać musimy autorowi, iż oryginalności w obrazkach jego brak się czuć daje”[10] (Lesznowski, 1854, nr 262, s. 3). Супраць гэтых і іншых закідаў пратэставаў Ю.І. Крашэўскі, бо „zbiorek uległ już ostréj a nie ze wszystkiém słusznéj krytyce”[11] (Kraszewski, 1854, nr 268, s. 1). Звернем яшчэ ўвагу на высокую ацэнку, якую даў гісторык літаратуры Фрыдэрык Генрык Левэстам (1817–1878) вобразу суддзі Гарбузіка: „Ma on swoją stronę typową, bo pełen facecyjek i dobrodusznego humoru szlachcic, zacny pan domu i wiosek, przedstawia zarazem obraz bogatego dziedzica, który zrośnięty z językiem i baśniami swoich chłopków, w nich tylko widzi dowcip, w nich narodową mądrość i praktyczne pojęcie”[12] (Lewestam, 1854, nr 266, s. 3).

Пэўна, А. Плуг планаваў уключыць *Spowiedź* таксама ў *Zupełny zbiór pism* (у шасці тамах), але напачатку 1860-х гг. (да паўстання 1863 г.) выйшлі толькі два першыя тамы.

За другую палову жыцця (1863–1903) пісьменнік са сваіх дапаўстанцкіх твораў перавыдаў хіба толькі раман *Duch i krew. Kilka zarysów z życia towarzyskiego* (1859; 1897).

Падобна на тое, што *Spowiedź* не стала аб’ектам даследавання тагачасных літаратуразнаўцаў. Сентыментальная гісторыя маладых людзей з ліцвінска-беларускага Палесся не цікавіла і польскамоўнага чытача XIX ст. Нават сам пісьменнік, звярнуў на гэта ўвагу, калі ў *Wstępie, którzy czytelnikowi wolno opuścić* да другога тома „zbioru obrazków, gawęd i fraszek rymowanych i nierymowanych” *Zagon rodzinny* укладвае ў вусны свайго школьнага калегі наступныя разважанні:

> Co do *Spowiedzi*, powiedz mi, jak można było w dzisiejszym wieku czysto-rozumowym, w dzisiejszym wieku czynu, brać za bohatéra powieści jakiegoś mazgaja, który nie spełniwszy żadnego znakomitego czynu, uroiwszy sobie, że zburzył szczęście swojéj ulubionéj tém że ją przez parę miesięcy pieścił pocałunkami i sentymentalną rozmową, ucieka w lasy i pracuje nad szczęściem chłopów, a na dobitkę umiera z suchot! w pokoju wybitym kirem!! z portretem kochanki na ściennie!!! i zostawia ci w puściźnie swoję niedorzeczną *Spowiedź*, którą trzeba było natychmiast w ogień wrzucić [...].

---

8 „У аповесцях Плуга шмат юначага энтузіязму, шмат таленту, але мала жыцця”.

9 Крыптанім Вацлава Пшыбыльскага.

10 „Трэба заўсёды нагадваць аўтару, што ў абразках ягоных недахоп арыгінальнасці адчуваецца”.

11 „Збор ужо трапіў пад жорсткую і не зусім слушную крытыку”.

12 „Ён мае і сваю адметнасць: гэта шляхціц, поўны жартаўлівасці і дабрадушнага гумару, шаноўны гаспадар дома і вёсак, разам з тым паўстае вобраз заможнага дзедзіча, які, знітаваны з моваю і казкамі сваіх сялянаў, бо толькі ў іх бачыць досціп, народную мудрасць і практычны розум”.

> Powtarzam ci, co twierdzą ludzie pełni wiedzy, ludzie zapatrujący się na świat z czysto-rozumowego stanowiska, dla których *innej dzisiaj pieśni trzeba*, dla których nawet zginęły już pieśni, a wstały *czyny*[13] (Pług, 1854b, t. II, s. 17).

А на пачатку XX ст. *Spowiedź* трапіла ў поле зроку ўвішнага беларускага працаўніка Рамуальда Зямкевіча (1881–1944?), які апантана займаўся вывучэннем гісторыі беларускамоўнае літаратуры, усяго пісьменства на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага. Пра А. Плуга і ягонае прыватнае жыццё ён мог даведацца ад сваіх варшаўскіх знаёмых. Прычым асобныя дэталі, праўдзівасць якіх сёння не выклікае сумнення, надзвычай важная для гісторыкаў літаратуры. Напрыклад, шмат чаго вартая ягоная інфармацыя, якую „агучыў” Яўхім Карскі пра Ялегі Пранціша Вуля[14]:

> Его имя Franciszek Eligiusz Karaffa-Korbutt. Умеръ въ Варшавѣ въ 80-хъ г. У него въ Варшавѣ собирался бѣлорусскій кружокъ: Плугъ (Петкевичъ А.), Коротынскій и др. Сообщеніе Р. Земкевича»[15] (Karskij, 1922, s. 68).

Істотна тое, што будучы беларусіст паходзіў з сям’і друкара-наборніка Аляксандра Юзафа Зямкевіча (1849–1917)[16], які, пэўна, з сярэдзіны 1870-х гг. працаваў у тыпаграфіі Міхала Зямкевіча (1829–1888) на Кракаўскім Прадмесці 415[17], а падчас навучання ў варшаўскай рэальнай гімназіі дапамагаў вядомаму

---

13 “Што да *Споведзі*, дык скажы мне, як можна было ў нашым, чыста разумовым стагоддзі, у нашым стагоддзі чыну, браць за героя аповесці нейкага слабака, які не здзейсніўшы аніякага выбітнага чыну, уявіўшы сабе, што разбурыў шчасце свае любае тым, што яе пару месяцаў песціў пацалункамі і сентыментальнай размовай, уцякае ў лясы і працуе над шчасцем сялянаў, а напрыканцы памірае ад сухотаў! у пакоі, абабітым чорным сукном!! з партрэтам каханае на сцяне!!! і пакідае табе ў спадчыну сваю недарэчную *Споведзь*, якую трэба было неадкладна кінуць у агонь. [...] Паўтараю табе, – гэта сцвярджаюць людзі адукаваныя, людзі, якія глядзяць на свет з чыста разумовага пункту гледжання, для якіх *іншае сёння песні трэба*, для якіх нават сканалі ўжо песні, а паўсталі *чыны*”.

14 У лістападзе 1912 г., публікуючы верш *К Дудару Арцему ат надзвінскага мужыка*, рэдакцыя „Нашае Нівы” не ведала, хто хаваецца пад псеўданімам Ялегі Пранціш Вуль. Пэўна, не ведаў гэтага тады яшчэ і Р. Зямкевіч, але змог даведацца цягам некалькі наступных гадоў.

15 „Яго імя Franciszek Eligiusz Karaffa-Korbutt. Памёр у Варшаве ў 80-я гады. У яго ў Варшаве збіраўся беларускі гурток: Плуг (Пяткевіч А.), Каратынскі і інш. Паведамленне Р. Зямкевіча”.

16 Ягоны бацька Станіслаў, «Пенсіонеръ» (маці Катажына з Вуйціцкіх памерла ў 1872 г.), у 1877 г. жыў у Варшаве на вуліцы Przyrynok, відаць, у Domie schronienia starców św. Ducha i Panny Marii (гл.: APW, zespół 1217d, online).

17 Ці былі Міхал, сын Мацея Зямкевіч і Аляксандар, сын Станіслава Зямкевіч сваякам, мы не ведаем. Але цікавым з’яўляецца тое, што Міхал у 1877 г. быў сведкам на шлюбе Аляксандра і Аляксандры з Сарыюшаў-Вікашэўскіх (1852–1924) Зямкевічаў (гл.: APW, zespół 1217d, online).

бібліяфілу Зыгмунту Вольскаму (1862–1931) парадкаваць ягоную бібліятэку; пазней, у 1905–1906 гг. працаваў у „Antykwariacie Polskim" Гераніма Вільдэра (1876–1941) (гл.: Michaluk, 2006, s. 209–232), а таксама ў Міхала Федароўскага (1853–1923), „przepisując dla niego białoruskie pieśni dla następnych tomów *Ludu białoruskiego*"[18] (AGAD, sygn. $140_2$, s. 55).

Знаёмства з беларускамоўным корпусам тэкстаў паспрыяла таму, што варшаўскі паляк адчуў у сабе патрэбу працаваць дзеля беларускае культуры, адчуў сябе беларусам. Методыка ягонае працы не заўсёды была этычнаю. Па-першае, ён збіраў сваю калекцыю, „пазычаючы" дзе толькі мог рэдкія беларускія матэрыялы, нягледзячы на тое, што яго колькі разоў лавілі на гарачым учынку і сурова каралі; па-другое, няраз свядома фальшаваў выяўленыя дакументы, надаючы ім адмысловы беларускі характар.

У сваім апісанні збору Р. Зямкевіча польскі гісторык кнігі Эдвард Хвалевік (1873–1956) у пераліку беларускіх і польскіх літаратараў, рукапісы якіх ёсць у калекцыі на Хмельнай 68, А. Плуга не згадвае (гл.: Chwalewik, 1927, t. 2, s. 440).

Зрэшты, публікуючы ў кастрычніку 1918 г. у часопісе „Варта" гумарыстычнае апавяданне *Кручаная баба*, гісторык літаратуры адно кажа: „...удалося нам мець у руках беларускі рукапіс Адама Плуга з 1849 года" (Zemkevič, 1918, s. 22). Гэта хіба азначае, што гаспадар рукапісу не згадзіўся прадаць ці ахвяраваць дакумент Р. Зямкевічу. Відаць, дазволіў зрабіць копію. Хто быў тагачасным гаспадаром рукапісу, даследнік не паведамляе, дык дастаткова складана здагадацца пра месцазнаходжанне дакумента. Маёнткам Сноў у 1840-я гг. валодалі Казімір Рдултоўскі (1785–1855) і ягоны сын Яўстах Рдултоўскі (1823[19]–1902), але ў 1854 г. ён перайшоў ва ўласнасць[20] барона Густава Гартынга (1819–1879) і ягоных нашчадкаў.

Вядома, што ў 1915 г. Р. Зямкевіч працаваў у „bibliotece pana Kanstancina Swiatopołk-Zawadzkaha ŭ miastečku Krošynie" (Ziemkiewič, 1919, № 5, s. 5). Пэўна, ён зацікавіўся і зборамі сноўскага палацу, дзе выявіў беларускі „рукапіс А. Плуга", ахвяраваны Яўстаху Рдултоўскаму. Зрэшты, з архівам Рдултоўскіх даследнік мог пазнаёміцца і ў больш блізкай ад Крошына Адахаўшчыне, дзе жылі нашчадкі[21] школьнага калегі (?) А. Плуга.

Знаходка была для Р. Зямкевіча надзвычай істотнай: ці не ўпершыню, дзякуючы ёй, можна было сказаць, што знаны польскі літаратар, аўтар шэрагу

---

18 "Перапісваючы яму беларускія песні для наступных тамоў *Ludu białoruskiego*".

19 Метрыка шлюбу Яўстаха Рдултоўскага з Мальвінаю Кунцэвіч ад 12 верасня 1845 г. сведчыць, што ён нарадзіўся ў 1823 ці напрыканцы 1822 г. (гл.: LVIA, 1667/1/6, online).

20 Нібыта Сноўскі палац Яўстах прагуляў у карты (гл.: Zagacki, 2012, online).

21 Адахаўшчынаю (сёння вёска ў складзе Крашынскага сельсавета) на пачатку XX ст. валодаў сын Яўстаха Ян Хрызастом (1850–?) ці ягоны ўнук Казімір (1898–1940).

вядомых празаічных і вершаваных твораў належыць і да беларускай літаратуры, бо пісаў па-беларуску.

Палітычныя падзеі 1917–1918 г. (Лютаўская рэвалюцыя, нараджэнне Беларускае Народнае Рэспублікі) патрабавалі новага асэнсавання літаратурнага працэсу на беларускіх землях; патрабавалі „з'яўлення" новых ды значных літаратараў і літаратурных твораў. Р. Зямкевіч якраз актыўна знаёміць у гэты час беларускага чытача са слаўнымі беларускімі дзеячамі мінулага. Ён публікуе артыкулы пра Францыска Скарыну (*Значэньне Францішка Скарыны ў Беларускай культуры*, „Вольная Беларусь", 1917, № 13; *Друк Скарыны і друк сучасны*, „Вольная Беларусь", 1917, № 15; *Francišk Skoryna*, „Biełaruskaje žyćcio", 1919, № 3), Васіля Цяпінскага (*Wasil Ciapiński*, „Biełaruskaje Žyćcio", № 5), Станіслава Манюшку (*Станіслаў Манюшко і беларусы*, „Беларускае Жыцьцё", 1920, № 1), змяшчае ў перыядычных выданнях невядомыя альбо малавядомыя дасюль беларускамоўныя творы (*Хто я?*, „Вольная Беларусь", 1918, № 19; *Тэатр*, „Вольная Беларусь", 1918, № 25; *Ясьне Вяльможнай Пані Арэшчысе* (Францішка Багушэвіча), *Добрыя весьці* (Уладзіслава Сыракомлі), *Малітва* (Язэпа Жукоўскага), „Варта", 1918, № 1; *Дунін-Марцінкевічу, беларускаму поэту* (Аляксандар Ельскі), „Беларусь", 1920, № 2).

У шэрагу такіх публікацый і надрукаванае ў часопісе „Варта" (1918, № 1) апавяданне *Кручаная баба* ды невялікая нататка (*Увага*) пра беларускасць Адама Плуга.

Пададзім цалкам *Увагу*, а пасля ўважліва прыгледзімся ейнаму зместу, а таксама ўсёй гэтай публікацыі:

> Увага. Мала хто ведае, што вядомы польскі пісьменьнік Адам Плуг, пісау у сваей моладасці па беларуску. Чытаючы карэспандэнціі Адама Плуга да польскіх газэт у старых гадавіках, спатыкаем вельмі часта урыукі песен, беларускіе звароты і тым падобнае. Залічыць яго да беларускіх пісьменнікау на гэтай падставе было бы несправедліва. Але удалося нам мець у руках беларускі рукапіс Адама Плуга з 1849 года, у якім былі 4 апаведаньня з жыцця народа і адна легенда. Рукапіс быу ахвяраваны пану Эустахію Рдултоускаму, аб чым сьведчыць надпіс: „Wielmożnemu Panu Marszałkowi Eustachemu Rdułtowskiemu, miłośnikowi języka ludu białorusińskiego składa na pamiątkę Autor". Адам Плуг (*1823 – †1903) пісау прозай і вершам. З вершау яму прыпісываюць беларускую легенду „Аб папе з рагамі". Вучыуся ен у Слуцкай гімназіі, гдзе у той час быу гурток беларусау, з катораго і выйшлі некаторые беларускіе пісацелі і дзеячы, староннікі скасаваньня прыгону. Вышэй надрукованае аповеданне мы даем згодна з тэкстам арыгінала (Zemkevič, 1918, s. 22).

Па-першае, Р. Зямкевіч сцвярджае, што А. Плуг пісаў па-беларуску. Па-другое, ён ведае ягоныя „карэспандэнцыі"[22], дзе сустракаюцца фрагменты

[22] Маюцца на ўвазе допісы А. Плуга ў варшаўскія і іншыя перыядычная выданні.

беларускіх песень, беларускія словы і фразеалагізмы. Па-трэцяе, апублікаваныя тэксты А. Плуга не даюць падстаў называць яго беларускім пісьменнікам. Па-чацвёртае, існуе беларускамоўны рукапіс літаратара, у якім знаходзяцца чатыры апавяданні. Прыпісваецца яму таксама легенда *Аб папе з рагамі*[23]. Па-пятае, беларускі рукапіс ахвяраваны Яўстаху Рдултоўскаму. Па-шостае, апавяданне *Кручаная баба* датаванае наступным чынам: „Сноу, 1849 г.”.

Мы лічым, што сцверджанні Р. Зямкевіча не заўсёды дакладныя. Сапраўды: як і чым можна пацвердзіць, што А. Плуг у маладосці пісаў па-беларуску? Пётр Хмялёўскі (1848–1904), які калісь працаваў з рукапісамі ранніх твораў пісьменніка, не згадвае не-польскамоўных тэкстаў. Наадварот, вершы і проза А. Пяткевіча, на яго думку, вызначаліся адсутнасцю „prowincyonalizmów i niepoprawnych zwrotów” (Chmielowski, 1898, nr 23, s. 448). Увогуле, з якою мэтаю і дзеля каго мог пісаць малады літаратар па-беларуску? Ён, як амаль усе пісьменнікі Літвы-Беларусі, карыстаецца добра распрацаванаю польскаю моваю, якая вывучалася ў тагачасных навучальных установах, якая была моваю навукі і літаратуры, якую шанаваў вышэйшы клас грамадства – шляхта. Польскамоўныя творы без праблемаў, хоць і ўласным коштам можна было выдаць у Мінску, Вільні, Кіеве і інш., не кажучы ўжо пра шматлікія выдавецкія цэнтры Польскага Каралеўства, Прусіі і Аўстрыі; можна было апублікаваць у віленскіх альманахах, у часопісе Ю.І. Крашэўскага „Athenaeum”, які ў 1841–1851 гг. выходзіў шэсць разоў на год. Вядома, можна было надрукаваць уласным коштам і беларускамоўную кніжку. Але кожны аўтар мусіў задаць сабе пытанне: а хто будзе чытаць мастацкую літаратуры па-беларуску, хто набудзе такую кніжку? Прынамсі, калі А. Пяткевіч выдаваў за свае, цяжка заробленыя грошы сваю першую кніжку *Wigilia św. Jana* (1847), дык пэўна ж спадзяваўся не толькі вярнуць затрачанае, але і мець прыбытак. Гэтая кніжка напісаная па-польску, але на падставе беларускіх народных паданняў пра ведзьму, якая забірае малако ад кароў, пра чароўную костку згатаванага чорнага ката, пра кветку-папараць (*paryło*). Можа, малады А. Пяткевіч запісваў па-беларуску народныя паданні, якія пазней выкарыстоўваў у сваіх польскамоўных творах? Гэтага мы выключаць не можам, але каб упэўнена сцвярджаць падобнае, патрэбны важкія аргументы.

Можна згадзіцца з Р. Зямкевічам, што ў друкаваных тэкстах А. Плуга часта сустракаюцца беларускамоўныя звароты. Праўда, не так у карэспандэнцыях, як у мастацкіх творах. Тут хіба ён ішоў следам за Габрыэлем Асоўскім (пам. у 1874 г. у Плоцку) (*Tajemnicze domino czyli Skutki niestałości: romans satyryczno-obyczajowy*), Марцінам Асорыя (*Coś tu psem świerdzi*), Вінцэнтам Дунінім-Марцінкевічам (*Sielanka: Opera we dwóch aktach*) і інш., якія з большым альбо меншым поспехам уводзілі ў свае творы беларускамоўныя персанажы. А гэта надавала натуральнасці выказванням герояў-сялянаў. Прынамсі, польскамоўных

[23] Пра атрыбуцыю дадзенага тэкста (Haŭstovìč, 2016, s. 125–128).

аўтараў прываблівала фразеалагічнае багацце беларускае мовы, магчымасць перадаць мясцовы каларыт любае Літвы-Беларусі.

Сцвярджэнне Р. Зямкевіча пра існаванне беларускамоўнага рукапісу А. Плуга немагчыма сёння верыфікаваць: дакумент хіба не захаваўся, але датаванне апавядання *Кручаная баба* „Сноу, 1849 г." выклікае сумненні ў праўдзівасці напісанага даследнікам хоць бы з тае прычыны, што ў 1849 г. пісьменніка не было на Беларусі; жывучы ў Джурыне на Падоллі, ён не мог напісаць пад рукапісам „Сноу, 1849 г.". Іншая справа, калі рукапіс сапраўды ўзнік у Снове. Тады ўзнікае пытанне: а хто ён, той перапісвальнік-тлумач, што падрыхтаваў „зборнік" беларускамоўных твораў А. Плуга?

А самае цікавае ў нататцы Р. Зямкевіча – гэта сцвярджэнне, што ў рукапісе знаходзіліся чатыры беларускамоўныя апавяданні пісьменніка. Тытулаў гэтых апавяданняў, апрача, вядома, *Кручанае бабы*, даследнік не падае, але – дзіўная рэч! – у аповесці А. Плуга *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela* маецца таксама чатыры дыктэрыйкі-паказкі, у якіх сяляне размаўляць па-беларуску[24]. Праўда, апавяданне *Кручаная баба* называецца там *A jak pan sało krau*, што нібыта не адпавядае заяўленаму Р. Зямкевічам: маўляў, твор ён дае „згодна з тэкстам арыгінала".

Дзіўна яшчэ і тое, што апавяданне *Кручаная баба*, надрукаванае ўпершыню ў 1918 г., а пасля колькі разоў перадрукаванае, ніхто з беларускіх даследнікаў не параўнаў з адпаведным фрагментам аповесці *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela*. Супастаўленне дае магчымасць па іншаму зірнуць на справу атрыбуцыі беларускамоўнага твора.

На нашую думку, мы маем справу з перакладам: тэксты амаль ідэнтычныя. Адзін з іх, аповесць *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela*, мы дакладна ведаем, стварыў А. Плуг і апублікаваў у трох тамах часопіса „Athenaeum" (t. III–V) за 1849 г. Рукапіс апавядання *Кручаная баба* выйшаў з-пад пяра пісьменніка нібыта таксама ў 1849 г. у Снове, але, як мы адзначалі вышэй, А. Плуг не жыў і не прыязджаў тады на Літву-Беларусь.

Можна выказаць такое меркаванне: малады А. Пяткевіч напісаў апавяданне *Кручаная баба* на падставе пачутае паказкі падчас свайго побыту на Літве-Беларусі, а пасля выкарыстаў яго (як і іншыя беларускамоўныя апавяданні) у польскамоўнай аповесці. Рукапіс з беларускамоўнымі тэкстамі ў 1849 г. ён выслаў у маёнтак Сноў „miłośnikowi języka ludu białorusińskiego" Яўстаху Рдултоўскаму, хоць, на нашую думку, больш адпаведным было б прэзентаваць

[24] Апрача паказкі *A jak pan sało krau* з XV раздзела *Nowa dykteryjka Sędziego. Niedźwiedź* у аповесці змешчаныя яшчэ тры двухмоўныя фацэцыі: *Żurauli* (XII раздзел *Żorawie*), *Utry nos, babko* і *A Najświętsza Matka tałałach, tałałach* (XVII раздзел *Choroba ciała i duszy. Halina. Piękne zamiary. Troskliwość przyjaciół. Jeszcze dyrteryjki*).

сябру (?) нумары часопіса „Athenaeum”, дзе друкавалася аповесць, ці рукапіс гэтае аповесці.

Такім чынам, цалкам давяраючы Р. Зямкевічу, мы павінны разважаць пра магчымасць існавання дзвюх версій, што паўсталі ў 1849 г., а гэта значыць, літаратар, напісаўшы адну моўную версію, сам пераклаў яе на другую мову. Скажам, ужо даслаўшы аповесць *Spowiedź...* Ю.І. Крашэўскаму, падрыхтаваў чатыры беларускамоўныя гісторыі-показкі, можа, нават пачутыя калісь ад Я. Рдултоўскага, і гэтак ушанаваў прыяцеля.

У 1918 г. Р. Зямкевіч, нібыта нічога не ведаючы (?) пра тры публікацыі аповесці *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela*, выявіў беларускі рукапіс А. Плуга і паспяшаўся аб’явіць яго беларускім літаратарам.

Аднак застаюцца сумненні. І не толькі таму, што няма даверу да напісанага Р. Зямкевічам. Сумненні ў тым, што апавяданне *Кручаная баба* напісанае ці перакладзенае з польскае мовы на беларускую самім аўтарам – А. Плугам.

Мы лічым, што рукапіс апавядання *Кручаная баба* паўстаў на падставе публікацыі аповесці *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela* ў часопісе „Athenaeum”; і што гаворка можа ісці пра пераклад з польскае на беларускую мову, ажыццёўлены не А. Плугам, а нейкім іншым.

Вось некалькі аргументаў, якія пацвярджаюць нашую думку.

Па-першае, у беларускай версіі выкасаваныя і замененыя шматкроп’ем выразы, якія ў аповесці характарызуюць, як слухачы ўспрымаюць дыктэрыйку-показку пана Суддзі:

| *Spowiedź. Ustęp z życia mego przyjaciela* (1849) | *Кручаная баба* (1918) |
|---|---|
| Był sobie jeden gospodarz taki biédny co strach! niech Pan Bóg broni! ale pracowity, uczciwy, trzeźwy, i gdyby nie żonka, to nawet byłby szczęśliwy; ale w niéj całe licho siedziało, jak to najczęściéj bywa, nie przymawiając.<br>**– Cha, cha, cha! rozśmiał się poważnie pan Karabela – to bo to biéda, powiém waspanu z żonkami!**<br>**– Bodajże większa bez żonek! rzekła sędzina.**<br>– Cicho Święty Jacku! Baba z wozu, kołom lżej – przerwał jéj sędzia, i ciągnął daléj: otoż całe licho w żonie siedziało | Жыу на сьвеці адзін гаспадар, ды такі бедны: ажно страх, ніхай Бог крыя; але працавіты, справядлівы, цьвярозы і, калі\|б ня жонка, дык быу\|бы нават шчасьлівы; на нішчасьце у жонцы яго цэлае ліхо сядзело, як гэта, ня тут кажучы, часьценька і бывае у людзей...<br><br>Во гэтае-ж цэлае ліхо і сядзело у жонцы |

Відавочна, „прысутнасць” герояў аповесці (пана Карабелі і жонкі суддзі Гарбузіка) у беларускай версіі зусім непатрэбная. Тое ж самае можна сказаць і пра непатрэбнасць прысутнасці ў апавяданні асобы наратара – суддзі Гарбузіка (тут абышлося і без шматкроп’я):

| | |
|---|---|
| ale **Święty Jacku**! żadnego w świecie sekretu zachować nie mogła | але **глаунае**: ніякага сэкрэта, **крый Божэ**! утрымаць ні магла. |

„Święty Jacku!” – гэта ў мове суддзі Гарбузіка звыклая прымоўка, якую ён – у адпаведнасці з тагачаснаю літаратурнаю модаю – выкарыстоўвае ледзь не ў кожным сказе. Перакладнік не мог яе пакінуць у сваім тэксце, дык з’явілася дадатковыя, незалежныя ад арыгінала выразы.

Па-другое, перакладнік даволі часта папраўляе беларускія рэплікі герояў А. Плуга:

| | |
|---|---|
| ***Awa***! wykrzyknęła żona, ***dziwo daj hodzi***! | «Ов-ва! – крыкнула жонка, – вось дзіва так дзіва»! |

Альбо:

| | |
|---|---|
| **pastojże hadzinka**! pajdu ja da pana, skazu szło ty najszou hroszy.<br>– Idzi k czortu maciery! | **Пачэкай-жэ, гадзюка**! пайду я да пана, **усе чыста** скажу, як ты знайшоу грошы.<br>«Ідзі к **чортавай мацеры**!» |

Ці:

| | |
|---|---|
| – Chłusić Panoczku! breszeć! krzyczała zawzięta baba, najszou **jejbohu**! w toj samy dzień jak **tucza** iszła z pirahami. | «Хлусіць, паночку! брэшэць! – крычала заузятая баба, – знайшоу **далібог знайшоу**, у той самы дзень як **хмара** ішла з пірагамі». |

І яшчэ:

| | |
|---|---|
| – Kruczanaja panoczku! rzekł mąż, załamując ręce, **dolaż maja, dola**! | «Кручаная, паночку!» – сказау муж, ламаючы рукі, «**Вось і доля мая, доля нешчасная**!» |

Дадзеныя праўкі могуць сведчыць, што перакладнік не „пагаджаецца” на беларускую мову А. Плуга, „мадэрнізуе” яе ў адпаведнасці са сваім лексічным запасам, бо цяжка дапусціць што сам літаратар робіць такія замены.

Па-трэцяе, перакладнік сям-там імкнецца ўдакладніць тэкст арыгінала, нават пашырыць яго:

| | |
|---|---|
| da-j zakopywać zaczął, bornucząc: ten weźmie te pieniądze, kto tutaj siedm głów położy | пачау закапываць, **кладзючы лапатай хрэсты** і балмочучы: «Той хай зможэ узяць усе грошы, хто тут узложыць сем галоу». |

Альбо:

| | |
|---|---|
| a jak przypomniał sobie, oj lichoż maciery! pomyślał, sieli piatyhorcy makom, kabyła porach zjeła![25] Co tu poradzić? | а як прыпомніу сабе, **што зрабіу глупства, кажучы аб гэтым жонцы**, падумау сабе: „А ліха-ж яе мацеры! Селі пяцігорцы макам, кабыла порах зьела! **Што я нарабіу**? Як цяпер на гэта парадзіць?» |

25 А. Плуг выкарыстоўвае беларускія прыказкі, якія азначаюць „пацярпець крах, няўдачу, прапасці, загінуць”. Пяцігорцы – конніца ў войску ВКЛ.

Па-чацвёртае, – і самае істотнае – перакладнік не ведае асобных слоў, ужытых А. Плугам, а таму тлумачыць недакладна:

| | |
|---|---|
| Poszedł do miasteczka, nakupił pirogów tak ze cztéry kopy i przyniósł do domu. Kopę rozsypał na dworze, z kopę na dach zarzucił, **trochę między snopy w przepłocie powtykał**, a resztę zabrał do chaty... | Пайшоу у мястэчка, накупіу пірагоу больш за чатыры капы дый прынес у хату. Капу расыпау на дварэ, капу кінуу на страху, **панатыкау крыху у плецень**, дый решту узяу у хату... |

Тут польскае слова *przepłot* (беларускае *пераплот*[26]) аўтар перакладу замяняе на *пляцень*. Відавочна, перакладнік, не звязаны вясковаю гаспадаркаю, не зразумеў, чаму ў пераплоце знаходзяцца снапы, дык выкарыстоўвае больш адпаведнае, на яго думку, слова.

Альбо:

| | |
|---|---|
| a nad nim ćma **bąków** latała | а над ім летала цьма **аваднеу** |

Перакладнік ведае толькі беларускага „авадня” (па-польску – „giez”), хоць „bąk” – гэта „сляпень”[27].

Ці:

| | |
|---|---|
| Powraca do domu, aż no po drodze spotyka męża **z koszem na ryby**, i dziwo! **w koszu** cztery szczupaki i dwa młode zające.<br>– *Szto heta*?! pyta się znowu.<br>– *A szto*, odpowiada chłopek, *postawiu ja* ***kosz na rybu****, a Boh dau rybu i zajca*. | Варочаецца баба дамоу, ажно па дарозе сустрэчаець мужа **з гацьцю на рыбы**, ды вось дзіва, **у гаці** чатыры шчукі ды два маладые зайцы.<br>«Што гэта?» І зноу пытаецца.<br>«А што, – адказывае муж – паставіу я **гаць на рыбы**, а Бог дау рыбы ды зайцау». |

Вядомыя нам слоўнікі беларускае мовы не фіксуюць слова „гаць” у значэнні „прылада ці прыстасаванне, якое служыць для лоўлі рыбы”, а іх было нямала[28]. „Гаць” – гэта „насціл з бярвення, галля, ламачча для праезду цераз балота ці гразкае месца”, „запруда” (Atrahovìč [red.], 1978, t. II, s. 41). Хіба толькі ў манаграфіі Ганны Івановай *Микротопонимия Мозырского Полесья* сустракаем слова „гаць” з адметным значэннем:

---

[26] „ПЕРЕПЛОТЪ, -у, с. м. Два высокіе вблизи гумна столба, соединенные между собою поперечными жердями, на которыя развѣшиваютъ для просушки разный промокшій немолоченный хлѣбъ. Мокрыя сноповья пшеницы, гречиху, горохъ разложиць по переплоту” (Nasovìč, 1983, s. 407).

[27] Зрэшты, хоць гэта зусім розныя інсекты, іх часта блытаюць.

[28] Напрыклад, буч (кош, вярша), ез, закот, кацец, настаўка, нерат, венцер, скрыпка, ват, жак, каробка, мярэжа, паплаў, сак і інш. (гл.: Lamaka, 1998, s. 26).

ГАТКА *ж. рч.* 23. На речке имелась запруда */гаць/* для ловли рыбы. ***Гатка*** дем. от гаць. ГАТКІ *мн. лес* 101, ГАТКІ *мн. п.* 27. В лесу был небольшой водоём, который перегораживали /перагачвалі/, чтобы удобнее ловить рыбу (Ivanova, 2007, s. 51).

Аднак у А. Плуга селянін сваёю прыладаю не толькі лавіў рыбу, але і нёс у ёй злоўленае дадому. Ці мог сам аўтар замяніць „kosz na ryby” ў польскім тэксце на „гаць” у беларускім? Хіба, не. Зрабіў гэта перакладнік, які паўсюль імкнуўся „збеларусаваць” твор (прыгадаем замену слова „tucza” на слова „хмара”).

Падобнае назіраем яшчэ ў адным выпадку:

| | |
|---|---|
| przybiega wreszcie mokrzuteńki od potu jak ruda mysz, a w ręku **połeć słoniny** trzyma | урэшця прыбегае ен мокры ад пота бытцам рудая мыш, а у руцэ трымае **здор сала** |

Перакладнік замест „полць[29] сала” ці „кавалак сала” ўжывае зусім неадпаведнае „здор сала”, бо „здор” і „сала, ці саланіна” – гэта розныя рэчы. Відавочна, ён не можа дакладна перадаць значэнне слова „połeć”.

Па-пятае, у перакладзе сустракаецца літаральнае тлумачэнне асобных выразаў, хоць „віноўны” тут А. Плуг, які ў польскім тэксце ўжываў беларусізмы:

| | |
|---|---|
| kazał biédną babulę zaprowadzić do studni, i wylać na głowę kilka wiader wody, żeby jéj **hłuzdy przywrócić**. | прыказау бабу завясьці да студні дый выліць ей колькі ведзяр вады на галаву, каб ей **глузды прыураціць** |

Выкарыстанае А. Плугам беларускае слова „глузды”[30] перакладнік перадае нязменна, а польскае „***przywrócić***” беларусізуе, замест таго, каб ужыць адпаведнае беларускае „аднавіць” ці „вярнуць”.

Прыкладна тое самае сустракаем яшчэ раз:

| | |
|---|---|
| była to szelma z pod ciemnéj gwiazdy | і была-ж яна шэльмай с пад цемнай зоркі |

А. Плуг выкарыстаў тут беларускія касмаганічныя ўяўленні і прымхі пра паходжанне зорак:

Зуорак туолькі на не́бе, колькі на сьвіеце людз́ей: як р́одзіцца чалавіек, та анёлы й запа́ляць на не́бе зуорку, а як чалавіек уміра́е, та яго зуорка падае з н́еба, бо яе́ анёлы ту́шаць. [...] Калі чалавіек до́бры, ма́ло грыэшыць, то яго́ зуорка я́сная, а калі ён грыэшны, та яго́ зорка чуць блішчы́ць, а то саўсім не сьвіецiць, ка́жуць-жэ, што ***ён шэ́льма з-пад цёмнае зуоркі*** (Seržputoŭskì, 1930, s. 6–7).

[29] „ПОЛЦЬ, -и, с. ж. (Составлено изъ пол и цяць – пополамъ разрубить). 1) Полотокъ, въ особенности половина гуся или утки. *Цѣлую полць въ одзинъ горщокъ положи.* 2) Полоса свинаго сала, вырѣзанная въ длину. *Кладзи полци въ рядъ*” (Nasovìč, 1983, s. 463).

[30] „ГЛУЗДЫ, -овъ, с. м. употр. во множ. 1) Мозгъ. *Глузды повернулись въ головѣ. Ци есць у цебе глузды, што такъ говоришъ*? 2) Память, умъ. *Ци тобѣ глузды отняло, што ты не помнишъ*? (Nasovìč, 1983, s. 113).

У польскай мове дадзенае словазлучэнне выступае ў крыху іншай форме – „łotr spod ciemnej gwiazdy" ці „typ spod ciemnej gwiazdy" і азначае першнаперш бандыта альбо хулігана. Вядома, і беларускае „шэльма з-пад цёмнае зоркі" таксама магло датычыць нейкага там ліхадзея, але ў дыктэрыйцы суддзі Гарбузіка жонка гаспадара яўна не належала да такога тыпу людзей.

На нашую думку, рукапіс апавядання *Кручаная баба* (калі ён сапраўды існаваў у зборах Рдултоўскіх) не мог належаць пяру А. Плуга. Той тэкст, што апублікаваў Р. Зямкевіч, стварыў іншы чалавек. Магчыма, гэта быў сучаснік А. Плуга, нехта з атачэння сноўскага магната, але найбольш верагодна – сам Р. Зямкевіч. Нагадаем: менавіта з перакладаў на беларускую мову апавяданняў Васіля Стафаніка (1871–1936) пачаў сваю публікацыйную дзейнасць у 1909 г. знаны бібліяфіл і гісторык літаратуры. Апрача таго, мы лічым, што менавіта Р. Зямкевіч на падставе *Pisni ukrinciw kozakiw* скампанаваў (пераклаў-перапрацаваў) *Piesniu biełaruskich žaunerou 1794 hoda*. Прынамсі, вядома, што ён меў у сваіх зборах надзвычай рэдкі асобнік украінскае ўлёткі (гл.: Voznâk 1928, s. 103), а рукапіс беларускага твора, што колісь захоўваўся ў Віленскім беларускім музеі імя Івана Луцкевіча (Haŭstovìč, 2018, s. 36–39), занатаваны ягонаю рукою.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA


Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie, Archiwum Prozorów i Jelskich, sygn. 140-2, Materyały bibliograficzne z zakresu literatury białoruskiej uzbierane przez Al. Jelskiego.

Archiwum Państwowy m. st. Warszawy, Akta stanu cywilnego Parafii Rzymskokatolickiej Narodzenia NMP Warszawa–Leszno, 1877, Pobrano z: https://metryki.genealodzy.pl/index.php?op=pg&id=1021&sy=1877&kt=2&plik=054-055.jpg (dostęp: 8.03.2025).

Atrahovìč, Kandrat (rèd.). (1978). *Tlumačal'ny sloŭnìk belaruskaj movy ŭ pâcì tamah*, t. 2. Mìnsk: BSÈ. [Атраховіч, Кандрат (рэд.). (1978). *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў пяці тамах*, т. 2. Мінск: БСЭ].

Chmielowski, Piotr. (1898). Listy z Zakątka: Pierwsze utwory Adama Pługa. *Biesiada Literacka: Pismo Literacko-Polityczne Ilustrowane*, 23, s. 448.

Chwalewik, Edward. (1927). *Zbiory polskie: Archiwa, Bibljoteki, Galerje, Muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w ojczyźnie i na obczyźnie*, t. 2. Warszawa–Kraków: Wydawnictwo J. Mortkowicza.

Haŭstovìč, Mìkola. (2016). *Dasledavannì ì matèryâly. Lìtaratura Belarusì XVIII–XIX stagoddzâŭ*, t. 2. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW. [Хаўстовіч, Мікола. (2016). *Даследаванні і матэрыялы. Літаратура Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў*, т. 2. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW].

Haŭstovìč, Mìkola. (2018). *Dasledavannì ì matèryâly. Lìtaratura Belarusì kanca XVIII–XIX stagoddzâ*, t. 4. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW. [Хаўстовіч, Мікола. (2018). *Даследаванні і матэрыялы. Літаратура Беларусі канца XVIII–XIX стагоддзя*, т. 4. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW].

Ivanova, Anna. (2007). *Mikrotoponimiâ Mozyrskogo Poles'â. Monografiâ*. 2-e izd. Mozyr′: UO MGPU im. I.P. Šamâkina. [Иванова, Анна. (2007). *Микротопонимия Мозырского Полесья. Монография*. 2-е изд. Мозырь: УО МГПУ им. И.П. Шамякина].

Karskij, Efimij. (1922). *Bѣlorusy*, t. III: *Očerki slovesnosti bѣlorusskago plemeni*, kn. 3: *Hudožestvennaâ literatura na narodnom âzykѣ*. Petrograd: Rossijskaâ Gosudarstvennaâ Akademičeskaâ Tipografiâ. [Карскій, Ефимій. (1922). *Бѣлорусы*, т. III: *Очерки словесности бѣлорусскаго племени*, кн. 3: *Художественная литература на народномъ языкѣ*. Петроградъ: Россійская Государственная Академическая Типографія].

Kraszewski, Józef Ignacy. (1854). List do Redakcyi „Gazety Warszawskiej”. *Gazeta Warszawska*, 268.

Lamaka, Vâčaslaŭ. (1998). Namìnacyì loŭčyh pryladaŭ u belaruskìh sloŭnìkah. U: *Vocabulum et vocabularium: Sb. naučn. trudov po leksikografii*, vyp. 5 (s. 26–27). Grodno: GrGU. [Ламака, Вячаслаў. (1998). Намінацыі лоўчых прыладаў у беларускіх слоўніках. У: *Vocabulum et vocabularium: Сб. научн. трудов по лексикографии*, вып. 5 (с. 26–27). Гродно: ГрГУ].

(Lesznowski, Antoni). (1854). (rec.) Zagon rodzinny: Zbiór obrazków, gawęd i fraszek rymowanych i nierymowanych przez Adama Pługa. Wilno. Nakładem i drukiem J. Zawadzkiego. T. 3. 1854 r. *Gazeta Warszawska*, 262.

Lewestam, Fryderyk Henryk. (1854). (rec.) Ruch Literacki: Zagon rodzinny: Zbiór obrazków, gawęd i fraszek rymowanych i nierymowanych przez Adama Pługa. 3 tomy. Wilno. Nakładem Józefa Zawadzkiego. *Gazeta Codzienna*, 266.

Lietuvos valstybes istorijos archyvas, Vilniaus Šv. Jono Krikštytojo ir Šv. Jono Apaštalo ir Evangelisto Romos katalikų bažnyčia. 1843–1846, 1667/1/45. Pobrano z: https://www.epaveldas.lt/preview?id=1667%2F1%2F6 (dostęp: 4.02.2025).

Michaluk, Dorota. (2006). „Jestem przyjacielem Białorusinów...” – raporty wywiadowcze Romualda Ziemkiewicza do II Oddziału Sztabu Generalnego z lat 1922–1923. *Białoruskie Zeszyty Historyczne*, 25, s. 209–232.

Nasovìč, Ìvan. (1983). *Sloŭnìk belaruskaj movy*. Mìnsk: BSÈ ìmâ P. Broŭkì. [Насовіч, Іван. (1983). *Слоўнік беларускай мовы*. Мінск: БСЭ імя П. Броўкі].

Pietkiewicz Antoni. (1847). *Wigilia świętego Jana: opowiadanie fantastyczne*. Wilno: Drukiem Józefa Zawadzkiego.

Plug, Adam. (1918). Kručanaâ baba. Apavedanne. *Varta*, 1, s. 20–22. [Плуг, Адам. (1918). Кручаная баба. Апаведанне. *Варта*, 1, с. 20–22].

Plug, Adam. (2013). Spovedz′. Uryvak z žyccâ majgo pryâcelâ. U: *Zalataâ kalekcyâ belaruskaj lìtaratury ŭ 50 tamah*, t. 5: *Lìtaratura drugoj palovy XIX stagoddzâ*, č. 2 (s. 504–585). Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Плуг, Адам. (2013). Споведзь. Урывак з жыцця майго прыяцеля. У: *Залатая калекцыя беларускай літаратуры ў 50 тамах,* т. 5: *Літаратура другой паловы XIX стагоддзя*, ч. 2 (с. 504–585). Мінск: Мастацкая літаратура].

Pług, Adam. (1849a). Spowiedź: Ustęp z życia mego przyjaciela. *Athenaeum*, III, s. 129–172.

Pług, Adam. (1849b). Żukowy Borek. *Athenaeum*, III, s. 229–240.

Pług, Adam. (1849c). Spowiedź: Ustęp z życia mego przyjaciela. *Athenaeum*, IV, s. 201–241.

Pług, Adam. (1849d). Spowiedź: Ustęp z życia mego przyjaciela. *Athenaeum*, V, s. 85–115.

Pług, Adam. (1854a.) Spowiedź: Ustęp z życia mego przyjaciela. W: Pług, Adam. *Zagon rodzinny: Zbiór obrazków, gawęd i fraszek rymowanych i nierymowanych*, t. I (s. 7–143). Wilno: Nakładem i drukiem Józefa Zawadzkiego.

Pług, Adam. (1854b). Wstęp, który czytelnikowi wolno opuścić. W: Pług, Adam. *Zagon rodzinny: Zbiór obrazków, gawęd i fraszek rymowanych i nierymowanych*, t. II (s. 7–20). Wilno: Nakładem i drukiem Józefa Zawadzkiego.

Pług, Adam. (1858). *Pamiątki domowe*. Warszawa: Nakładem braci Belinów, księgarzy Mińskich.

Pług, Adam. (1863a). Słówko wstępne. W: *Zupełny zbiór pism Adama Pługa: serya II, tomów sześć*, t. 2 (s. IX). Wilno: Nakładem i drukiem A.H. Kirkora.

Pług, Adam. 1863b. Piosnka rodzinna. W: *Zupełny zbiór pism Adama Pługa: serya II, tomów sześć*, t. 2 (s. 179–275). Wilno: Nakładem i drukiem A.H. Kirkora.

Seržputoŭskì, Alâksandar. (1930). *Prymhì ì zababony belarusaŭ-palâšukoŭ*. Mensk: BAN. [Сержпутоўскі, Аляксандар. (1930). *Прымхі і забабоны беларусаў-палявшукоў*. Менск: БАН].

Vâroŭkìn-Šèlûta, Ŭladzìslaŭ. *Zgurtavan'ne belaruskaj šlâhty.* [Вяроўкін-Шэлюта, Ўладзіслаў. *Згуртаваньне беларускай шляхты*]. Pobrano z: https://www.nobility.by/forum/index.php?topic=107.0 (dostęp: 10.01.2025).

Voznâk, Mihajlo. (1928). Do počatkìv novogo ukraïn′skago pis′menstva. U: Mihajlo Gruševs′kij (red.). *Naukovij zbìrnik za rìk 1928* (s. 100–107). Kiïv: Deržavne vidavnictvo Ukraïni. [Возняк, Михайло. (1928). До початків нового українськаго письменства. У: Михайло Грушевський (ред.). *Науковий збірник за рік 1928* (с. 100–107). Київ: Державне видавництво України].

W.P. (Przybylski, Wacław). (1854). Korrespondencya „Gazety Warszawskiej”. *Gazeta Warszawska*, 148.

(Witte, Karol). (1850a). O ruchu literackim. *Gazeta Warszawska*, 272.

(Witte, Karol). (1850b). O ruchu literackim. *Gazeta Warszawska*, 273.

Zagacki, Dymitr. (2012). *O dawnych właścicielach Juszkiewicz, Czernichowa, Adachowszczyzny*. Pobrano z: https://polesie.org/2036/o-dawnych-wlascicielach-juszkiewicz-czernicho wa-adachowszczyzny/ (dostęp: 5.02.2025).

Zemkevìč Romual′d. (1918). Uvaga. *Varta*, 1, c. 22 [Земкевіч Ромуальд. (1918). Увага. *Варта*, 1, c. 22].

Ziemkiewič, Romuald. (1919). Wasil Ciapiński. *Biełaruskaje Žyćcio*, 5.

SUBMITTED: 2025.06.25
ACCEPTED: 2025.07.11
PUBLISHED ONLINE: 2026.01.30

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Mikałaj Chaustowicz / Мікола Хаўстовіч** – Polska, Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki; prof., dr hab.; *specjalność naukowa*: literaturoznawstwo białoruskie; *zainteresowania naukowe*: literatura białoruska w XIX wieku, polsko-białoruskie związki literackie.

*Adres:* ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa, Polska

*Wybrane publikacje:*

1. Хаўстовіч, Мікола. (2023). *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзя*, т. 9. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW.

2. Хаўстовіч, Мікола. (2023). Псеўданімы Юльяна Ляскоўскага (117–123). У: *Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэзентацыі: зборнік навуковых артыкулаў па выніках IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай памяці Пятра Васючэнкі*. Мінск: МДЛУ.
3. Хаўстовіч, Мікола. (2023). Юльян Ляскоўскі як беларускамоўны літаратар. *Studia Białorutenistyczne*, 17, s. 125–137.
4. Хаўстовіч, Мікола. (2024). *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX стагоддзя*, т. 10. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW.
5. Хаўстовіч, Мікола. (2025). *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзя*, т. 11. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW.